Весці БДПУ. Серыя 2. 2022. № 4. С. 14-19

УДК [94:338.45](476)“1861/1914”

# МАДЭРНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў ДВАРАНСКАЙ ПРАМЫСЛОВАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1861–1914 гг.)[1]

**А. П. Жытко,**
*доктар гістарычных навук,*
*прафесар кафедры гісторыі Беларусі*
*і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага*
*педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка;*

**С. А. Талмачова,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі*
*і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага*
*педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 29.09.22.

UDC [94:338.45](476)“1861/1914”

# MODERNIZATION PROCESSES IN THE NOBLE INDUSTRY ON THE TERRITORY OF BELARUS (1861–1914)

**A. Zhitko,**
*Doctor of History, Professor of the Department*
*of History of Belarus and Slavic Peoples*
*Belarusian State Pedagogical University*
*named after Maxim Tank*

**S. Tolmacheva,**
*PhD in History, Associate Professor, Head*
*of the Department of History of Belarus*
*and Slavic Peoples Belarusian State Pedagogical*
*University named after Maxim Tank*

Received on 29.09.22

У артыкуле мадэрнізацыйныя працэсы ў цэнзавай прамысловасці аналізуюцца праз прызму ўплыву на іх палітыкі расійскага ўрада ў заходніх губернях, наступстваў паўстання 1863–1864 гг. у дачыненні да памесных дваран-католікаў, асаблівасцей рэалізацыі рэформы 1861 г. у краі. Паказана, што дваранская прамысловасць Беларусі мела даволі працяглую гісторыю да моманту скасавання прыгоннага права. Таму навуковае асвятленне яе развіцця на этапе капіталізму ўключае ў сябе раскрыццё праблемы пераходу дваранскай прамысловасці ад феадальных да буржуазных прынцыпаў дзейнасці, а таксама высвятленне яе ролі ў агульным працэсе станаўлення капіталістычнай прамысловасці ў парэформенны перыяд. Неабходнасць такога даследавання выклікана і тым, што ў савецкай гістарыяграфіі сфарміраваўся погляд на тое, што дваранская прамысловасць сваім існаваннем абмяжоўвала свабодную канкурэнцыю ў сувязі з манапольным валоданнем вышэйшым саслоўем сыравіннымі крыніцамі і таму ў цэлым аказвала адмоўны ўплыў на станаўленне і развіццё бессаслоўнай прамысловасці. Такі падыход з’явіўся вынікам абсалютызацыі партыйна-класавага падыходу ў агульнай канцэпцыі развіцця дваранска-памешчыцкай гаспадаркі як перажытку феадалізму на капіталістычнай стадыі.
Мадэрнізацыя дваранскай прамысловай вытворчасці разглядаецца метадам пагаліновага аналізу, што дазволіла выявіць як яе сувязь з сыравіннымі крыніцамі, так і з запатрабаваннямі рынку. Устаноўлены рознargчасовасць і рознапрасторавасць пачатку прамысловага перавароту ў розных галінах дваранскай прамысловай вытворчасці.

*Ключавыя словы:* мадэрнізацыя, дваранства, прамысловая вытворчасць, Беларусь, прамысловы пераварот, капіталізм.

In the article the modernization processes in census industry are analyzed through the prism of influence of Russian government policy in the western provinces, consequences of 1863–1864 rebellion towards Catholic nobility, peculiarities of the 1861 reform in the region. It is shown that noble industry in Belarus had quite a long history before the abolition of serfdom. Therefore, the scientific coverage of its development at the stage of capitalism includes the disclosure of the problem of noble industry transition from feudal to bourgeois principles of activity, as well as clarification of its role in the general process of formation of capitalist industry in the post-reform period. The need for such research is also caused by the fact that the Soviet historiography formed the opinion that the noble industry restricted free competition due to the monopoly of the upper class ownership of the sources of raw materials, and therefore had a negative impact on the formation and development of the non-social estates industry. This approach was the result of absolutization of the party-class approach in the general concept of the development of noble and landlord economy as a vestige of feudalism at the stage of capitalism.
The modernization of noble industrial production is considered by the method of branch-by-branch analysis, which revealed both its connection with the raw material base and demands of the market. The diversity of time and place of the beginning of the industrial revolution in various branches of noble industrial production is determined.

*Keywords:* modernization, nobility, industrial production, Belarus, industrial revolution, capitalism.

[1] Артыкул падрыхтаваны ў межах выканання задання «Деятельность органов государственного управления по реализации социально-экономической политики в белорусской деревне (1861–1914 гг.) (№ ДР 20211358») Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Общество и гуманитарная безопасность белорусского государства», падпраграмы «История» на 2021–2025 гг.

*Уводзіны.* Мадэрнісцкая парадыгма ў дачыненні да развіцця прамысловасці прадугледжвае раскрыццё працэсу пераходу да машыннай вытворчасці. Як вядома, першая фабрыка на тэрыторыі Беларусі была заснавана ў мястэчку Хомск Кобрынскага павета дваранінам В. Пуслоўскім. У 1860 г. у Беларусі налічвалася 86 прадпрыемстваў з паравымі рухавікамі. Гэта сведчыла аб пачатку тэхнічнага, а не прамысловага перавароту, як прынята лічыць у гістарыяграфіі. Справа ў тым, што прамысловы пераварот уяўляе сабой дынамічны складаны факт гістарычнай рэчаіснасці, сукупнасць сутнасных рысаў якога складалі пераход ад ручной працы да машыннай з якасна новымі тэхналогіямі і непарыўнасцю вытворчага працэсу. Акрамя гэтага, абавязковай умовай пачатку прамысловага перавароту з'яўляецца наяўнасць рынка свабоднай, прафесійна падрыхтаванай рабочай сілы і роўных нарматыўна-прававых асноў у заснаванні фабрык і заводаў для прадстаўнікоў усіх саслоўных груп насельніцтва. Менавіта гэтыя ўмовы ў Беларусі пачалі рэалізоўвацца пачынаючы з 1863 г. з пераводам сялян на абавязковы выкуп. Складаны факт рэчаіснасці (прамысловы пераварот) пачынаецца з моманту ўступлення ў дзеянне апошняй яго сутнаснай рысы. Таму пачатак гэтага перавароту ў беларускім краі адносіцца да пачатку 60-х гг. XIX ст.

*Асноўная частка.* Акрамя земляробства і жывёлагадоўлі, памешчыкі надавалі значную ўвагу прамысловай вытворчасці. У сувязі з рэформай 1861 г. усе прадпрыемствы, заснаваныя на прымусовай працы, закрыліся альбо былі пераведзены на вольнанаёмную працу. Прамысловасць атрымала неабмежаваныя рэзервы асабіста вольнай рабочай сілы з ліку абеззямеленых і пралетарызаваных сялян, а таксама рынак для збыту прадукцыі, які пастаянна пашыраўся і паглыбляўся ў ходзе разбурэння натуральнай і паўнатуральнай памешчыцкай і сялянскай гаспадарак. Развіццю памешчыцка-дваранскай прамысловасці садзейнічала і шпаркае будаўніцтва чыгунак, шашэйных дарог, павелічэнне попыту на лесаматэрыялы, прадукты хімічнай прамысловасці, якая працавала на мясцовай сыравіне і інш. Па няпоўных і супярэчлівых даных, колькасць дваранска-памешчыцкіх цэнзавых прадпрыемстваў пастаянна павялічвалася. Так, у 60-х гг. XIX ст. у 35 беларускіх паветах дзейнічалі 94 дваранскія мануфактуры і фабрыкі, ці 83,0 % ад іх агульнай колькасці. У 1901 г. толькі фабрык і заводаў у руках дваран было 454, што складала 53,8 % ад іх агульнай колькасці, а ў 1913 г. — 615, альбо 48,0 % [1, с. 118–119; 2, с. 173–174].

Такім чынам, з 60-х гг. XIX ст. да 1913 г. колькасць дваранска-памешчыцкіх прадпрыемстваў цэнзавай прамысловасці павялічылася ў 6,5 разы, але доля іх сярод іншых саслоўяў паменшылася ў 1,7 разы. Гэта азначае, што чыста буржуазная прамысловасць развівалася значна больш хуткімі тэмпамі, чым прамысловасць абуржуазіўшыхся памешчыкаў. Разам з тым, вызначыць дакладна колькасць рабочых на фабрыках і заводах і суму іх вытворчасці па саслоўнай прыналежнасці вельмі складана. На падставе «Списка фабрик и заводов Европейской России» намі ўстаноўлена, што ў 1901 г. на дваранскіх прадпрыемствах з паравымі рухавікамі колькасць рабочых склала 8333 чал., а сума вытворчасці – 11 877 тыс. руб. [2, с. 173].

Важным з'яўляецца раскрыццё дынамікі развіцця фабрычна-заводскай прамысловасці па гадах. Да рэформы 1861 г. на сучаснай тэрыторыі Беларусі было заснавана 86 дваранскіх прадпрыемстваў з паравымі рухавікамі. У 60–70-я гг. працэс адкрыцця новых фабрык і заводаў запаволіўся. На гэта паўплывалі тыя ж прычыны, якія стрымлівалі і развіццё памешчыцкай сельскагаспадарчай вытворчасці. Да іх адносяцца асаблівасці скасавання прыгону ў беларускіх губернях. Так, у краі з 1863 г. сяляне пераводзіліся на абавязковы выкуп, што ліквідавала іх часоваабавязаны стан. Тым самым памешчыкі пазбавіліся дармавой рабочай сілы. Акрамя гэтага, канфіскацыя і секвестр маёнткаў прадугледжвалі пераход памесцяў удзельнікаў паўстання 1863–1864 гг. у распараджэнне казны з іх далейшымі распродажам і аддачай у арэнднае карыстанне выхадцам з унутраных губерняў імперыі. У такіх маёнтках прамысловыя прадпрыемствы, як правіла, прыпынялі сваю дзейнасць ці зачыняліся. Акрамя гэтага, дзесяціпрацэнтны збор з даходаў памесных дваран-каталікаў негатыўна сказаўся на магчымасцях адкрыцця новых фабрык і заводаў. Ажыўленне дваранскага прамысловага прадпрымальніцтва пачынаецца з 80-х гг., калі было заснавана 87 (19,2 %) прадпрыемстваў з паравымі рухавікамі. Асабліва гэта тычыцца 90-х гг. – перыяду прамысловага ўздыму. У гэты час узнікла 210 новых фабрык і заводаў, што склала 46,3 % ад іх агульнай колькасці ў 1901 г. [2, с. 174].

Разам з тым, у парэформенныя гады ўдзельная вага дваран сярод уладальнікаў фабрык і заводаў паступова скарачалася. Так, у 1860–1869 гг. суадносіны ўласнікаў-дваран і ўласнікаў-купцоў ва ўсёй цэнзавай прамысловасці раўняліся 5,2 да 1,0, а ў асобных галінах, як, напрыклад, харчасмакавай – 13,8 да 1,0, дрэваперапрацоўчай – 2,5 да 1,0, тэкстыльнай – 0,3 да 1,0. У гарбарна-абутко-

вай, металаапрацоўчай, сілікатна-будаўнічай і хімічнай галінах амаль усе мануфактуры і фабрыкі належалі дваранам. У 90-х гг. XIX ст. на 343 буйныя дваранскія прадпрыемствы прыходзіліся ўжо 293 купецкія, 89 мяшчанскія і 16 дзяржаўных і акцыянерных таварыстваў. Суадносіны ўласнікаў-дваран і іншых уласнікаў склалі 1,2 да 1,0, а ў такіх галінах, як харчасмакавая – 1,8 да 1,0, дрэваперапрацоўчая – 2,1 да 1,0, тэкстыльная – 0,1 да 1,0. У металаапрацоўчай, сілікатна-будаўнічай і хімічнай галінах, раней поўнасцю дваранскіх, цяпер на аднаго ўласніка з іншых саслоўяў прыходзілася адпаведна 0,1, 0,1 і 0,3 двараніна. Гарбарныя мануфактуры і фабрыкі ў гэтым дзесяцігоддзі поўнасцю належалі непрывілеяваным саслоўям [3, с. 116].

Важнае месца ў дваранскай фабрычна-заводскай вытворчасці займала апрацоўка смакавых і спажыўных рэчываў. У 1901 г. на яе долю прыходзілася 373 прадпрыемствы (82,1 %) з паравымі рухавікамі, 3394 рабочых (40,7 %), а сума вытворчасці складала 6639,6 тыс. руб. (55,9 %). Лідзіруючае месца тут займала вінакурства[1] [2, с. 175].

Адносна маладой вытворчасцю з'яўлялася дваранская крухмала-патачная. Першы такі завод узнік у 1873 г. у Магілёўскай губ. Пік іх заснавання прыпадае на прамысловы пад'ём 90-х гг. З 32 прадпрыемстваў 27 узніклі менавіта ў гэты час. Сыравінай служыла пераважна бульба. У Беларусі дваранскія крухмала-патачныя заводы былі невялікіх памераў. У сярэднім на адно прадпрыемства прыпадала 12–13 рабочых. Найбольшая іх колькасць (27 з 32) прыходзілася на Магілёўскую і Гродзенскую губерні. Сума вытворчасці гэтых заводаў у 1901 г. склала 367,3 тыс. руб. [2, с. 175]. Адным з буйных быў завод двараніна Папова ў Аршанскім павеце, на якім у 1881 г. перапрацоўвалася 600 пудоў бульбы ў суткі [4, с. 250].

Мукамольная вытворчасць з'яўлялася традыцыйнай. У 60–70 гг. дваранска-памешчыцкія млыны прыводзіліся ў рух з дапамогай вады, ветру і цяглавай сілы. Прамысловы пераварот у гэтай галіне пачынаецца з 80-х гг. Большасць паравых млыноў узнікла ў 90-х гг. XIX ст.

У 1901 г. 30 дваранскіх млыноў мелі паравыя рухавікі. На іх было занята 176 рабочых, а сума вытворчасці раўнялася 369,9 тыс. руб. Значная колькасць іх была сканцэнтравана ў Магілёўскай губ. – 12. Яны выдалі прадукцыі на суму 194,9 тыс. руб., альбо 52,7 % ад усіх паравых дваранскіх млыноў 35 паветаў. Праўда, на долю 2 млыноў прыходзілася па 81 800 руб. і 84 700 руб. выраблена́й прадукцыі [2, с. 176].

Пасля рэформы 1861 г. у Мінскай і Магілёўскай губернях захаваліся 4 буйныя цукровыя заводы. На заводзе Скірмунта ў Парэччы ў 1879 г. налічвалася 168 рабочых, было выраблена 8 тыс. пудоў рафінаду на 48 тыс. руб., хаця ў 60-х гг. сярэднегадавая вытворчасць складала 90 тыс. руб. [5, с. 74]. На заводзе Паскевіча ў Гомелі у 1879 г. працавала 232 чал., было выраблена 15 тыс. пудоў цукру на 64,5 тыс. руб. [6, с. 551].

Дваранская крупадзёрная вытворчасць была сканцэнтравана ў асноўным у Магілёўскай губ. З 144 крупадзёрняў ва ўласнасці дваран знаходзілася 31, альбо 21,5 %. Гэта былі дробныя прадпрыемствы. Агульная колькасць рабочых на іх складала ўсяго 45 чал., а валавы даход быў роўны 161 тыс. руб. Разам з тым, і ў гэтай галіне ў парэформены перыяд пачынаецца прамысловы пераварот. Да 1881 г. у губерні было заснавана 18 крупчатых заводаў, 12 з якіх належала дваранам з валавым даходам 66,2 тыс. руб. [4, с. 189–191].

Сярод прадпрыемстваў Беларусі з паравымі рухавікамі па перапрацоўцы шэрсці ў 1901 г. 5 належала дваранам. Сума вытворчасці склала 311,7 тыс. руб. [2, с. 176]. Найбольш вядомымі з іх была суконная фабрыка Скірмунта ў маёнтку Парэчча Пінскага павета. У 1865 г. сума валавай вытворчасці склала 214 тыс. руб. [5, с. 74]. У 1879 г. на гэтай фабрыцы былі 2 паравыя, 10 прадзільных машын, 420 рабочых, а сума вытворчасці дасягнула 300 тыс. руб. На суконнай фабрыцы Пуслоўскага ў маёнтку Альберцін Слонімскага павета у 1879 г. было задзейнічана 475 рабочых з гадавой вытворчасцю 254,6 тыс.руб. Адносна буйная фабрыка знаходзілася ў маёнтку Раванічы Ігуменскага павета двараніна Слацвінскага. Гадавая вытворчасць яе склала 38,2 тыс. руб. пры 101 рабочым [7, с. 714].

У 90-х гг. дваранамі было заснавана 3 фабрыкі па апрацоўцы шоўку. Фабрыка Слізеня ў маёнтку Лахозва Навагрудскага павета ўзнікла ў 1896 г. У 1901 г. на ёй было задзейнічана 125 рабочых з гадавой вытворчасцю на суму 33,6 тыс. руб. Фабрыка Пуслоўскага ў маёнтку Альберцін Слонімскага павета пры 108 рабочых выраблялa прадукцыі на суму 24,6 тыс. руб., а фабрыка гр. Тышкевіча і двараніна Маральскага ва ўрочышчы Фалют Гродзенскага павета дала прадукцыі на суму 21,1 тыс. руб. [8, с. 81, 83].

Значнае месца ў дваранскай фабрычна-заводскай прамысловасці займала папяровая вытворчасць. На 9 прадпрыемствах з паравымі рухавікамі ў 1901 г. было задзейнічана 1324 рабочых з сумай вытворчасці 2049,3 тыс. руб.

[1] Аб развіцці броварнай вытворчасці гл. артыкул Жытко А. П. і Філістовіч А. А. // Весці БДПУ. Сер. 2. – 2021. – № 4. – С. 39–45.

[2, с. 177]. Найбольш вядомай была фабрыка кн. Паскевіча ў Добрушы Гомельскага павета, заснаваная ў 1872 г. У 1878 г. яна была акцыяніравана. Таварыства ўстанавіла дзве буйныя турбіны і дзве паравыя машыны ў 500 к.с. Адной з першых у Беларусі яна была электрыфікавана. У 1879 г. на фабрыцы працавала 460 чал., сума вытворчасці склала 255 тыс. руб. На пачатку ХХ ст. колькасць рабочых дасягнула 900 чал., а сума вытворчасці – 1601,7 тыс. руб. [3, с. 83; 8, с. 150].

У 1886 г. узнікла папяровая фабрыка «Скіна» Валадковіча ў вёсцы Бліж Лепельскага павета. На ёй у 1901 г. быў задзейнічаны 231 рабочы, меўся лакамабіль у 379 к.с., сума вытворчасці складала 301,2 тыс. руб. У 1900 г. гр. Браэль-Плятэр у вёсцы Плятэр Дзісненскага павета заснаваў кардонную фабрыку, дзе працавала 54 чал., а сума вытворчасці склала 46,7 тыс. руб. [8, с. 133, 134].

Наяўнасць у памешчыкаў значных лясных масіваў з'яўлялася сыравіннай базай для развіцця вытворчасці па механічнай перапрацоўцы лесу і лесаматэрыялаў. У першыя парэформенныя гады дваране-памешчыкі практычна не займаліся перапрацоўкай драўніны. Звычайна яны прадавалі лес перакупшчыкам на пні. У Беларусі налічвалася нязначная колькасць лесапільных прадпрыемстваў. У 1862 г. памешчык Ястражымбскі заснаваў лесапільны завод у Магілёве. З дапамогай паравой машыны пры 5 рабочых тут было напілена 8 тыс. брусоў на суму 700 руб. [9, арк. 15]. У 1865 г. была зафіксавана 1 лесапільня ў Суражскім павеце [10, с. 131]. У 1866 г. у Брэсцкім павеце ўладальніцай лесапільні з'яўлялася графіня Красінская, а ў Мінскай губ. у 1876 г. быў зарэгістраваны толькі 1 дваранскі лесапільны завод [11, арк. 395].

Прамысловы пад'ём 90-х гг. станоўча паўплываў і на развіццё вытворчасці па механічнай апрацоўцы дрэва. З 25 дзейнічаўшых у 1901 г. лесапільняў з паравымі рухавікамі 24 былі заснаваны менавіта ў гэты перыяд. На іх былі сканцэнтраваны 552 рабочыя, а сума вытворчасці складала 818,5 тыс. руб., альбо 6,9 % ад усёй дваранскай фабрычна-заводскай вытворчасці [2, с. 178]. Найбольш буйнымі былі лесапільны завод двараніна Багуслаўскага ў вёсцы Рудня Рэчыцкага павета (23 рабочых, сума вытворчасці 132,4 тыс. руб.) і коркавы завод Кяневіча і Яленскага (55 рабочых і сума вытворчасці – 110,2 тыс. руб.) у г. Пінску [8, с. 205, 206].

У 1900–1913 гг. у Беларусі ўзнікла 139 новых лесапільных заводаў, што складала ў 1913 г. ¾ усіх прадпрыемстваў такога тыпу, якія дзейнічалі да гэтай пары ў краі. Адным з буйнейшых быў лесапільна-бандарны завод кн. Радзівіла ў маёнтку Дзянісавічы Слуцкага павета. Колькасць рабочых складала каля 150 чал. [12, с. 53].

Прамысловы пераварот, які ахапіў Беларусь у парэформенны перыяд, паўплываў на стварэнне прадпрыемстваў па апрацоўцы металаў, выпуску машын і г. д. Яшчэ ў 1850-х гг. на Старынкаўскім Чэрыкаўскага павета графа Бенкендорфа і Барысаўскім (Чарняўскім) металургічных заводах крычны спосаб атрымання жалеза быў заменены пудлінгавым. На іх выраблялiся паравыя машыны. Апошні завод належаў вялікаму князю Мікалаю Мікалаевічу [5, с. 297]. На буйнейшым у Беларусі Старынкаўскім заводзе да 1863 г. працавала каля 900 рабочых. У 1862 г. было выплаўлена чыгуну на 246 тыс. руб. Але з ліквідацыяй прыгоннай працы і ў сувязі са смерцю ўласніка завод у 1867 г. перапыніў сваю дзейнасць [13, л. 29].

Да пачатку 70-х гг. у Беларусі дзейнічалі, акрамя Чарняўскага, 2 дваранскія чыгуналіцейныя заводы, 1 медзеплавільны ў Магілёўскай губ. (17 рабочых і сума вытворчасці 2887 руб.) і 1 медзеплавільны і 1 жалезаапрацоўчы заводы ў Мінскай губ. [4, с. 192–193; 14, с. 114, 153].

У 1884 г. у Пінску баронам О'Гарыен дэ Ласі быў заснаваны суднабудаўнічы завод. Праз 10 гадоў у маёнтку Альбрэхтава Пінскага павета сталі даваць сваю прадукцыю чыгуналіцейны і механічны заводы. Тут выпускалі параходы, паравыя машыны для бровараў. На Пінскім заводзе ў 1900 г. працавала 183 чал., а сума вытворчасці склала 132,9 тыс. руб. На драцяна-цвіковым заводзе Папова ў вёсцы Барань Аршанскага павета (заснаваны ў 1873 г.) у 1880 г. працавала 57 чал. Іх заробак за 260 рабочых дзён вагаўся ад 120 да 900 руб. [4, с. 265–268]. У 1901 г. на гэтым заводзе было задзейнічана 99 чал., а сума вытворчасці склала 370,6 тыс. руб. [8, с. 280].

Дваранская хімічная прамысловая вытворчасць была ў асноўным звязана з перапрацоўкай дрэва і яго адыходаў. Яна была прадстаўлена пераважна дробнымі смалільна-шкіпінарнымі і дзягцярнымі прадпрыемствамі. Так, у 1865 г. у беларускіх паветах Віцебскай губ. налічвалася 6 смалакурных і дзягцярных прадпрыемстваў з 21 рабочым і сумай вытворчасці 4102 руб. [10, с. 130–136]. У 1866 г. у беларускіх паветах Гродзенскай губ. дзейнічала 5 шкіпінарных прадпрыемстваў. Усе яны належалі памешчыкам [11, л. 388–395]. У 1876 г. сума вытворчасці 15 дваранскіх смалільна-дзягцярных «заводаў» Мінскай губ. складала ўсяго 6106 руб. [14, с. 1–185]. У Магілёўскай губ. у 1881 г. з 59 дзягцярных, смалільных і шкіпінарных прадпрыемстваў 32 (54,2 %) з'яўляліся ўласнасцю дваран, на якіх працавала 119 чал.,

а валавы даход склаў 26 148 руб. [4, с. 189–191]. Для перапрацоўкі звычайна выкарыстоўваліся пні ці смала хвойных парод. Таму памер указаных прадпрыемстваў залежаў ад колькасці і якасці лесу ў таго ці іншага памешчыка. Толькі ў 1887 г. у Гродзенскай губ. было заснавана першае дваранскае прадпрыемства з паравым рухавіком. На гэтым смалільна-шкіпінарным заводзе ў 1901 г. былі задзейнічаны 4 рабочыя, а сума вытворчасці склала 1600 руб. У 1894 г. у Віцебскай губ. уступіў у строй дваранскі хімічны завод з 38 рабочымі і сумай вытворчасці 29,9 тыс. руб. У 1899 г. у Магілёўскай губ. быў заснаваны завод па сухой перагонцы дрэва. У 1901 г. на ім працавала 47 чал., а сума вытворчасці склала 46,3 тыс. руб. [8, с. 729, 731, 738].

Вытворчасць па апрацоўцы мінеральных рэчываў была звязана з выпускам будаўнічай прадукцыі. У парэформенны перыяд у памешчыкаў Беларусі дзейнічаў шэраг дробных цагельняў, прадпрыемстваў па выпуску вапны і шкла. Працавалі яны на мясцовай сыравіне, а прадукцыя выкарыстоўвалася як на патрэбы асабіста маёнткаў, так і на продаж [4, с. 149–194].

Невялікія прадпрыемствы па выпуску шкла з'явіліся яшчэ ў дарэформенны перыяд. У 1866 г. у Лепельскім павеце дзейнічалі 2 дваранскія шклозаводы, на якіх працавалі 43 чал., а сума вытворчасці складала 23 тыс. руб. [10, с. 122–129]. У Магілёўскай губ. з 4-х заводаў 3 належала дваранам (62 рабочыя, сума даходаў – 18 тыс. руб.) [4, с. 170–194].

У 1901 г. у вытворчасці будаўнічых матэрыялаў налічваліся 23 дваранскія прадпрыемствы з паравымі рухавікамі. На іх было сканцэнтравана 1752 рабочых, а сума вытворчасці дасягнула 1079,4 тыс. руб., альбо 9,1 % ад усёй дваранскай фабрычна-заводскай вытворчасці [2, с. 180]. Найбольш вядомымі былі хрустальныя фабрыкі «Нёман А» ва ўрочышчы Вустрань і «Нёман Б» ва ўрочышчы Магадзіно Лідскага павета, заснаваных дваранамі Краеўскім і Столле. На гэтых двух заводах у 1901 г. было задзейнічана 640 чал., а сума вытворчасці складала 258,6 тыс. руб. У 1898 г. Краеўскі сумесна з Панкевічам адкрылі шклозавод «Барысаў», на якім у 1901 г. працавала 170 рабочых, а сума вытворчасці дасягнула 78,1 тыс. руб. У 1899 г. Краеўскі і Столле заснавалі фабрыку ваконнага шкла ў вёсцы Ганцавічы Слуцкага павета. У 1870, 1886 і 1889 г. кн. Друцкім-Любецкім былі пабудаваны 3 цагельныя заводы ў Гродзенскім павеце. У 1901 г. на іх былі задзейнічаны 83 рабочыя, выпушчана 5,5 млн штук цэглы на суму 44 тыс. руб. [8, с. 342–344, 350, 368, 369].

Сярод прадпрыемстваў па апрацоўцы жывёльных прадуктаў выдзяляўся стэарынавы завод у маёнтку Альбрэхтава Пінскага павета. У канцы 60-х гг. на ім працаваў 121 чал., выраблялася свечак на 219 тыс. руб., мыла – на 50 тыс. і алеіну – на 30 тыс. руб. Завод быў абсталяваны 2 паравымі катламі, 7 гідраўлічнымі прэсамі, лакамабілямі. З далейшай механізацыяй вытворчых працэсаў колькасць рабочых памяншалася. У 1900 г. тут працавала 66 чал., а сума вытворчасці складала 275 тыс. руб. [3, с. 79–80].

*Заключэнне.* Такім чынам, мадэрнізацыйныя працэсы ў дваранскай прамысловай вытворчасці былі звязаны з прамысловым пераваротам, які разгарнуўся ў пачатку 60-х гг. XIX ст. Пры гэтым дадзены працэс не быў аднамомантным у розных галінах прамысловай вытворчасці. На прамысловы ўздым 90-х гг. прыпадае найбольшая колькасць заснаваных дваранскіх фабрык і заводаў. Разам з тым, у дваранскай фабрычна-заводскай вытворчасці ў парэформенныя гады наглядаўся дваякі працэс. З аднаго боку, колькасць дваранскіх прадпрыемстваў фабрычна-заводскага тыпу пастаянна павялічвалася. Сума вытворчасці, лік рабочых на прадпрыемствах узбуйняліся, але тэмпы гэтых прыростаў адставалі ад развіцця прамысловасці непрывеліяваных саслояў. Гэта было заканамерным вынікам капіталізацыі народнай гаспадаркі ў цэлым.

*Літаратура*


1. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Фонд 908. Воп. 1. Спр. 476.
2. *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму : манаграфія / А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2003. – 233 с.
3. *Болбас, М. Ф.* Промышленность Белоруссии. 1860–1900 / М. Ф. Болбас. – Минск : Изд-во Белорус. гос. ун-та, 1978. – 312 с.
4. Опыт описания Могилевской губернии : в 3 кн. – Могилев : Тип. губерн. правл., 1884. – Кн. 2. – 1000 с.
5. Труды Минского губернского статистического комитета. Историко-статистическое описание девяти уездов Минской губернии. – Минск, 1867. – Вып. 1. – 436 с.


*References*


1. Rasijski dzyarzhaŭny gistarychny arhiŭ. – Fond 908. Vop. 1. Spr. 476.
2. *Zhytko, A. P.* Dvaranstva Belarusi peryyadu kapitalizmu : managrafiya / A. P. Zhytko. – Minsk : BDPU, 2003. – 233 s.
3. Bolbas, M. F. Promyshlennost' Belorussii. 1860–1900 / M. F. Bolbas. – Minsk : Izd-vo Belorus. gos. un-ta, 1978. – 312 s.
4. Opyt opisaniya Mogilevskoj gubernii : v 3 kn. – Mogilev : Tip. gubern. pravl., 1884. – Kn. 2. – 1000 s.
5. Trudy Minskogo gubernskogo statisticheskogo komiteta. Istoriko-statisticheskoe opisanie devyati uezdov Minskoj gubernii. – Minsk, 1867. – Vyp. 1. – 436 s.

6. *Орлов, П.* Указатель фабрик и заводов Европейской России / П. Орлов. – СПб. : Тип. бр. Пантелеевых, 1881. – 980 с.
7. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1940. – Т. 2. – 903 с.
8. Список фабрик и заводов Европейской России. – СПб. : [Журн.] «Вестник финансов», 1903. – 838 с.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд 2001. Воп. 1. Спр. 818.
10. Памятная книжка Витебской губернии на 1866 год. – Витебск : Губерн. тип., 1866. – 184 с.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна. – Фонд 1. Воп. 28. Спр. 1049.
12. Экономика Белоруссии в эпоху империализма / под ред. Г. Т. Ковалевского. – Минск : Изд-во АН БССР, 1963. – 422 с.
13. НГАБ. – Фонд 2001. Воп. 1. Спр. 868.
14. Список землевладельцев в Минской губернии за 1876 год. – Минск : Мин. губерн. стат. ком., 1876. – 185 с.

6. *Orlov, P.* Ukazatel' fabrik i zavodov Evropejskoj Rossii / P. Orlov. – SPb. : Tip. br. Panteleevyh, 1881. – 980 s.
7. Dakumenty i materyyaly pa gistoryi Belarusi. – Minsk : Vyd-va AN BSSR, 1940. – T. 2. – 903 s.
8. Spisok fabrik i zavodov Evropejskoj Rossii. – SPb. : [Zhurn.] «Vestnik finansov», 1903. – 838 s.
9. Nacyyanal'ny gistarychny arhiŭ Belarusi (dalej – NGAB). – Fond 2001. Vop. 1. Spr. 818.
10. Pamyatnaya knizhka Vitebskoj gubernii na 1866 god. – Vitebsk : Gubern. tip., 1866. – 184 s.
11. Nacyyanal'ny gistarychny arhiŭ Belarusi ŭ g. Grodna. – Fond 1. Vop. 28. Spr. 1049.
12. Ekonomika Belorussii v epohu imperializma / pod red. G. T. Kovalevskogo. – Minsk : Izd-vo AN BSSR, 1963. – 422 s.
13. NGAB. – Fond 2001. Vop. 1. Spr. 868.
14. Spisok zemlevladel'cev v Minskoj gubernii za 1876 god. – Minsk : Min. gubern. stat. kom., 1876. – 185 s.